# ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ ЯК АСНОЎНАЯ ТЭНДЭНЦЫЯ РАЗВІЦЦЯ ЗМЕСТУ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

**Паўлава С. А.,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Працэсы глабалізацыі, якія ахопліваюць усе сферы жыцця, прыцягваюць увагу розных навукоўцаў. Паступова ствараецца агульная тэорыя глабалізацыі і нават новая навуковая дысцыпліна — глабалістыка.

Першымі пачалі вывучаць праблемы глабалізацыі філосафы, палітолагі. З іх пазіцый глабалізацыя разглядаецца як вышэйшая ступень інтэрнацыяналізацыі, як якасна новы яе этап. Ён характарызуецца такімі прыкметамі, як асэнсаванне свету як адзінага цэлага; адзінства свету на базе найноўшых дасягненняў інфармацыйна-тэхналагічнай рэвалюцыі; збліжэнне не толькі краін, але і грамадзян і г. д. Даследаванні паказваюць, што глабалізм выступае асноваю новай, постіндустрыяльнай цывілізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Відавочна, што працэсы глабалізацыі адбываюцца сёння не толькі ў эканоміцы, але ўсё больш ахопліваюць і сферу культуры. Культуролагамі зроблена шмат для асэнсаванне працэсаў глабалізацыі ў сферы культуры. Пытанні працэса ў глабалізацыі ў такой сферы беларускай культуры, як бібліятэчная справа, пакуль не знайшлі свайго месца. А гэтыя працэсы, безумоўна, адбываюцца. Першыя праяўленні глабалізацыйных працэсаў у сферы бібліятэчнай справы Беларусі можна акрэсліць з сярэдзіны 90-х гг. XX ст., калі перабудова ўсяго грамадства абумовіла пераўтварэнні і ў бібліятэчным свеце.

«Праблемы грамадства ў эпоху глабалізацыі спароджаны карэннымі памылкамі чалавецтва ў выбары каштоўнасных арыентацый» (Ю. Шрэйдэр) [5, с. 35]. Таму альтэрнатыву будучага трэба шукаць і ў сферы аксіялогіі. Маецца на ўвазе такая іерархія каштоўнасцей, у якой агульначалавечае валодае абсалютным прыярытэтам. Агульначалавечымі мы называем такія каштоўнасці, якія маюць аднолькавае значэнне ў розных краінах, у розныя перыяды, у розных сацыяльных групах і адлюстроўваюць інтарэсы і ідэалы большасці чалавецтва без уліку кан'юнктуры часу і соцыума: асоба, жыццё, каханне, сям'я і г. д. Замацаваныя ў культурных універсаліях, агульначалавечыя каштоўнасці забяспечваюць выжыванне і ўдасканаленне чалавецтва. Дадзенае палажэнне замацавана ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Абвяшчэнне прынцыпу адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям знайшло адлюстраванне і ў Законе аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь. Першым у пераліку прынцыпаў дзейнасці бібліятэк абвешчана вызначэнне агульначалавечых каштоўнасцей у якасці прыярытэтных. У гэты перыяд узніклі вольныя прафесійныя аб'яднанні (Бібліятэчны савет, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя), з'явілася магчымасць кантактаў з калегамі бліжняга і далёкага замежжа на кангрэсах ІФЛА, міжнародных канферэнцыях. Пад эгідай ББА пастаянна праводзяцца семінары, трэнінгі, круглыя сталы, якія прысвечаны актуальнай тэматыцы бібліятэчнай справы. У 2001 г. па ініцыятыве ББА было зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнае прафесійнае свята — «Дзень бібліятэк».

Павышэнню іміджу бібліятэкі як сацыяльнага інстытута садзейнічае і ініцыятыва асацыяцыі па выданню двух прафесійных часопісаў: «Бібліятэчны свет», «Бібліятэка прапануе». Беларуская бібліятэчная асацыяцыя разглядае развіццё міжнародных прафесійных сувязей на ўзроўні бібліятэк і прафесійных бібліятэчных супольніцтваў. Заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве з Грамадствам бібліятэкараў Літвы, Расійскай бібліятэчнай асацыяцыяй, Асацыяцыяй украінскіх бібліятэкараў. Гэтаму садзейнічае і дзейнасць замежных культурных цэнтраў, якія працуюць ў Беларусі (інстытут імя Гете, Брытанскі Савет, інфармацыйны цэнтр пры пасольстве ЗША і інш.). Беларускія бібліятэкары наведалі шмат бібліятэк замежжа, знаёміліся з іх дзейнасцю, з вопытам бібліятэчнага абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў, з характарам кіравання бібліятэкамі розных тыпаў і відаў. Усё гэта не магло не стымуляваць беларускага бібліятэкара да асмыслення сваёй дзейнасці, да параўнальнага аналізу.

Сёння бібліятэкі ў краіне сталі галоўнай апорай насельніцтва ў адукацыі, засваенні новых прафесій і набыцці сучасных ведаў. Пашыраецца кола сацыяльных функцый бібліятэк, дзе інфармацыйная функцыя выступае як прыярытэтная, якая дае магчымасць доступу да нацыянальных і сусветных інфармацыйных сетак і банкаў даных. Мяняюцца традыцыйныя ўнутрыбібліятэчныя тэхналогіі, формы бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва, характар узаемадзеяння з органамі ўлады, рознымі сацыяльнымі групамі. Бібліятэка павінна стаць своеасаблівым «электронным архівам» і «інтэлект-цэнтрам». Накіраванасць работы бібліятэк павінна адпавядаць чытацкім патрэбам і грунтавацца на сацыялагічных даследаваннях. Актуальнасць і неабходнасць сацыялагічных даследаванняў відавочна: ніводнае кіраўнічае рашэнне не можа быць прынята без дакладнага навуковага абгрунтавання, без глыбокага ведання сітуацыі, якая склалася. Сацыялогія дапаможа разабрацца ў заканамернасцях функцыянавання такога інстытута, як бібліятэка, спрагназаваць яе далейшае развіццё. Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэках могуць дапамагчы вырашыць не толькі глабальныя, канцэптуальныя, але і лакальныя ўнутрыбібліятэчныя пытанні. Яны дазваляюць атрымаць інфармацыю аб культурных запытах і пажаданнях насельніцтва, аб сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках карыстальнікаў, высветліць ступень задавальнення чытачоў дзейнасцю бібліятэк, удакладніць матывы іх наведвання і г. д. Наяўнасць такой інфармацыі дазваляе больш мэта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіравана працаваць з насельніцтвам, будаваць бягучае і перспектыўнае планаванне, вызначаць стратэгію бібліятэкі на будучае. Згодна з Законам «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» Нацыянальная бібліятэка Беларусі з'яўляецца галоўнай бібліятэкай рэспублікі і вядучай установай па прыкладных даследаваннях у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства і інфарматыкі. Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі шматаспектная і змястоўная. У галіне бібліятэказнаўства НББ выступіла ініцыятарам асэнсавання такіх інавацыйных кірункаў, як сацыякультурная дынаміка бібліятэчнай дзейнасці ў розных рэгіёнах — горадзе, раёне, вёсцы, у выніку чаго выпрацоўваюцца інавацыйныя мадэлі дзейнасці сучасных бібліятэк, дыягнаставанне сацыякультурнай, нацыянальнай сітуацыі. Такія даследаванні, як «Чытач навуковых бібліятэк г. Мінска і шляхі ўдасканалення яго абслугоўвання», «Структура і дынаміка дзіцячага чытання», «Чытач публічных бібліятэк» і інш. дазволілі па-новаму вырашаць задачы прывядзення бібліятэчных рэсурсаў і паслуг у адпаведнасць з запытамі карыстальнікаў. Асаблівая ўвага надаецца публічным бібліятэкам. Ролі і месцу публічнай бібліятэкі ў грамадстве прысвечана маштабнае даследаванне «Публічныя бібліятэкі Беларусі ў сацыякультурным асяроддзі». Каб зрабіць работу сістэмнай, многія бібліятэкі пайшлі шляхам распрацоўкі мэтавых праграм. Сёння ў рэспубліцы ажыццяўляецца больш за 500 асабістых і рэгіянальных праектаў.

Стымулюе развіццё культуры ў краіне дзейнасць Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Праходзяць творчыя акцыі, якія маюць вялікае грамадскае гучанне: ганаровае ўручэнне прэмій «За духоўнае адраджэнне» і сацыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Штогод Міністэрства культуры за кошт цэнтралізаваных фондаў і грантаў Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва аказвае дапамогу ўстановам культуры ў рэалізацыі праектаў. Так, з 1999 г. бібліятэкі атрымліваюць фінансавую дапамогу, больш за 11 бібліятэк і іх супрацоўнікаў сталі намінантамі спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне бібліятэчнай справы, многія бібліятэчныя работнікі за апошнія гады атрымалі ганаровыя званні «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь», урадавыя ганаровыя ўзнагароды.

У апошні час прыярытэтнай задачай развіцця бібліятэчнай справы з'яўляецца рэалізацыя асноўных кірункаў дзейнасці публічных бібліятэк Беларусі (камплектаванне фондаў і камп'ютэрызацыя бібліятэчных працэсаў).

З мэтай фарміравання ў Рэспубліцы Беларусь адзінай інфармацыйна-прававой прасторы, якая забяспечвае даступнасць прававой інфармацыі для ўсіх структур грамадства і кожнага грамадзяніна, пачалі ствараццa публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ) на базе сеткі бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры. Сёння іх у краіне 193 (50 тысяч карыстальнікаў).

Публічныя цэнтры прававой інфармацыі асабліва яскрава рэалізуюць адну з важных функцый, якая ўласцівая бібліятэцы як сацыяльнаму інстытуту — сацыялізацыю асобы, дапамагаюць чалавеку, перш за ўсё маладому, адаптавацца ў грамадстве, вырашаць свае жыццёвыя праблемы, а таксама здзяйсняюць інфармацыйна-прававую абарону асобы [3, с. 8]. Адносна кожнай групы спажыўцоў прававой інфармацыі (і адносна кожнай асобы) функцыя сацыялізацыі асобы ПЦПІ мае сваю афарбоўку ў сувязі з тым, якая канкрэтна дапамога аказваецца: інфармацыйная, сацыяльная, адукацыйная, кансультацыйная і г. д. Асабліва выразна сацыялізіруючы характар дзейнасці публічных цэнтраў прававой інфармацыі праяўляецца пры абслугоўванні сацыяльна неабароненых катэгорый карыстальнікаў: беспрацоўных, мігрантаў, інвалідаў, беспрытульных, пенсіянераў і інш., а таксама юнацтва.

Аднак застаецца праблема адсутнасці неабходнай тэхнікі для ажыццяўлення дзейнасці публічных цэнтраў прававой інфармацыі. Гэтую праблему, магчыма, вырашыць рэалізацыя рэспубліканскай Дзяржаўнай праграмы інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь на 2003–2005 гг. і на перспектыву да 2010 года «Электронная Беларусь», якая носіць міжгаліновы характар і грунтуецца на «Канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне інфарматызацыі». Мэта праграмы — фарміраванне ў рэспубліцы адзінай інфармацыйнай прасторы. Канчатковым вынікам яе стане стварэнне агульнадзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы, у рамках якой будзе сфарміраваны адзіны парадак збору, апрацоўкі, накаплення, захавання, пошуку і распаўсюджвання інфармацыі на базе ўдасканаленай інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай інфраструктуры і адзінага нацыянальнага інфармацыйнага рэсурсу. Прадугледжана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэнне базы даных нацыянальных аўтарытэтных файлаў, карпаратыўнай бібліятэчнай сеткі, ажыццяўленне нарматыўнай каталагізацыі на базе зводнага электроннага каталога, арганізацыя інтэрнет-партала «Культура», алічбоўка рэдкіх кніг. Можна сказаць, што і ў гэтым накірунку хоць і з вялікімі цяжкасцямі, але глабалізацыйныя працэсы ідуць. У межах галіновых праграм — «Памяць Беларусі», Дзяржаўнай праграмы па адраджэнню і развіццю сяла — ёсць пэўныя напрацоўкі. На базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ствараецца зводны электронны каталог. З 1993 г. пачата аўтаматызацыя бібліятэк краіны. Сёння 98% цэнтральных, гарадскіх і раённых бібліятэк аўтаматызаваныя, 76,8% маюць доступ да сеткі Інтэрнэт.

Ва ўмовах здзяйснення ў краіне эканамічных і сацыяльных перамен дзейнасць бібліятэчных устаноў усё больш залежыць ад кіраўнічых кадраў. Глабалізацыя ўзмацняе ролю суб'ектыўных фактараў. Можна мець удасканаленую кіраўнічую сістэму, прагрэсіўную тэхніку, але не дабавіцца эфектыўнасці дзейнасці бібліятэкі. Правільнае рашэнне бібліятэчных задач у рашаючай ступені залежыць ад авалодання кадрамі навукай кіравання, творчага выкарыстання яе заканамернасцей, прынцыпаў і метадаў, што дадуць магчымасць павысіць адказнасць бібліятэчных работнікаў за аператыўнае і якаснае выкананне рознабаковых запытаў карыстальнікаў.

У гэтым працэсе вельмі важную ролю адыгрывае арганізацыйная культура бібліятэкі. Гэта спецыфічная сістэма сувязей, адносін, узаемадзеяння людзей, спосабаў пастаноўкі і рашэння задач, якія стаяць перад калектывам [4, с. 68]. Арганізацыйная культура забяспечвае гарманізацыю калектыву і індывідуальных інтарэсаў. На яе аснове кожны супрацоўнік асэнсоўвае сваю ролю ў калектыве, ведае, чаго ад яго чакаюць і як зрабіць, каб адпавядаць гэтым патрабаванням. У той жа час любы член калектыву ведае, якія ён мае правы ў бібліятэцы. Арганізацыйная культура бібліятэкі таксама садзейнічае згуртаванасці яе калектыву, накіроўвае яго дзейнасць на дасягненне місіі, якая стаіць перад калектывам. У бібліятэказнаўстве дастаткова поўна абгрунтаваны змест арганізацыйнай культуры і паказаны шляхі яе фарміравання як фактара згуртаванасці і развіцця калектыва бібліятэкі [4, с. 77–78].

У межах невялікага артыкула немагчыма поўна паказаць уплыў глабалізацыйных працэсаў на змест дзейнасці бібліятэк рэспублікі. Аднак высвятленне больш значных яе бакоў дазваляе убачыць, як паступова ўваходзяць у жыццё беларускіх бібліятэк міжнародна прынятыя прафесійныя тэрміны, нормы, стандарты, тэхналогіі (як электронныя, так і сацыяльныя) і г. д. Гэта дае магчымасць абазначыць асноўныя кірункі глабалізацыйных працэсаў, якія адбываюцца ў бібліятэчным асяроддзі Беларусі.

Увесь змест дзейнасці бібліятэк будуецца па прынцыпу адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям:

- фарміраванне адзіных прафесійных каштоўнасцей (свабода інфармацыі, карыстальнік як прыярытэт бібліятэчнага абслугоўвання, захаванне аўтарскага права, прафесійная этыка і інш.);
- фарміраванне адзінай прафесійнай лексікі. Прыкладам рэалізацыі гэтага кірунку можа быць выданне тлумачальнага слоўніка навукоўцамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў [2];
- фарміраванне адзіных прыярытэтных кірункаў дзейнасці бібліятэкі (асабліва публічнай) і прыярытэтных чытацкіх груп (інваліды, сацыяльна неабароненыя);
- фарміраванне дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, тэхналогій, фарматаў, стандартаў сеткавай работы;
- фарміраванне знешняга і ўнутранага асяроддзя бібліятэкі;
- імкненне ў сваёй дзейнасці выконваць рэкамендацыі міжнародных бібліятэчна-інфармацыйных інстытутаў (ІФЛА, ЮНЕСКА, ЮНІСЕФ і інш.).

На жаль, у значна меншай ступені глабалізацыйныя працэсы закранулі сферу падрыхтоўкі персанала для бібліятэк Беларусі, улічваючы, што ў 1990-я гады яркай з'явай у сучаснай еўрапейскай адукацыі стаў Балонскі працэс, пад якім разумеецца буйнейшая структурная рэформа вышэйшай школы. Балонскі працэс мае сваю папярэднюю гісторыю. На працягу дзесяцігоддзяў ён зараджаўся ў еўрапейскай сістэме вышэйшай адукацыі, дзе ўжо даўно склаліся цыклы бакалаўрыята і магістратуры, развівалася акадэмічная мабільнасць студэнтаў і выкладчыкаў, выкарыстоўваліся акадэміч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя крэдыты розных тыпаў [1, с. 29]. У нашай краіне робяцца пэўныя крокі ў гэтым кірунку. Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе універсітэты будуць весці падрыхтоўку спецыялістаў на двух узроўнях — бакалаўрыята і магістратуры.

Такім чынам, глабалізацыя ўсіх сфер дзейнасці сучаснага свету і асабліва глабалізацыя інфармацыйнай прасторы лагічна падводзіць да глабалізацыі дзейнасці бібліятэк, да стварэння ў хуткім часе адзінай сусветнай бібліятэкі, у якой вызначальную ролю будзе адыгрываць і беларуская складаючая.

Глабалізацыйныя працэсы, якія адбываюцца ў бібліятэчнай сферы Беларусі, безумоўна, пазітыўныя, паколькі садзейнічаюць павышэнню якасці дзейнасці бібліятэк, яе адпаведнасці прынцыпу агульначалавечых каштоўнасцей, «падцягваюць» яе да агульнасусветнага ўзроўню. У той жа час гэтыя працэсы асэнсоўваюцца, асабліва для публічных бібліятэк, каб пазбегнуць уніфікацыі ў іх дзейнасці, таму што яны з'яўляюцца не толькі інфармацыйнымі, але і дасугавымі, культурнымі цэнтрамі мясцовага супольніцтва. Вельмі важна засвоіць міжнародны вопыт і захаваць своеасаблівасць, традыцыі і культуру свайго народа.

### ЛІТАРАТУРА


1. Капранова В. А. Болонский процесс: Истоки и современность // Веснік адукацыі. 2005. № 11. С.29.
2. Лявончыкаў В. Е. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў. Мн., 2000.
3. Мелентьева Ю. П. Публичные центры правовой информации: Новые возможности библиотечного обслуживания. М., 2004.
4. Пашин А. И. Бибилотека как социально-культурная система: Вопросы управления: Учебно-методическое пособие. М., 2005.
5. Рудакоўская І. В. Агульначалавечыя каштоўнасці як прыярытэт у дзейнасці бібліятэк // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк. Мн., 2004. С. 35.



***Pavlova S. A.***

*GLOBALIZATION AS MAIN TENDENCY IN THE DEVELOPMENT OF BELARUSIAN LIBRARIES*

*The subject covers the main directions in globalization processes in librarianship of the Republic of Belarus and their influence on the efficient functioning of the libraries. The information provided will be interesting and useful for academic staff, students and specialists in this sphere.*


## К ВОПРОСУ РАЗРАБОТКИ КОНЦЕПЦИИ ПРОЕКТНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ БИБЛИОТЕК


**Переверзева Ю. А.,**
**старший преподаватель кафедры менеджмента информационно-документной сферы**
**Белорусского государственного университета культуры и искусств**


Проектная деятельность — одно из инновационных направлений совершенствования и модернизации библиотечной работы, связанное с привлечением внебюджетных и целевых ресурсов для решения текущих и перспективных проблем развития отдельных библиотек и отрасли в целом. Проектной деятельности свойственна некоммерческая основа и социальная направленность, которые выражаются в организации эффективного библиотечного обслуживания населения и отдельных групп пользователей в условиях недофинансирования и сокращения сети государственных публичных библиотек. По данным статистики, за период 2001—2005 гг. отмечено существенное сокращение количества государственных публичных библиотек и ежегодное уменьшение количества их читателей [2], «сумма, которая выделяется на содержание отрасли, составляет 0,5% валового внутреннего продукта» [3, с. 5]. При этом библиотека остаётся самым востребованным и доступным информационным, образовательным и социокультурным учреждением, способствующим интеллектуальному и духовному развитию общества.

Эффективность системы библиотечного обслуживания в условиях рыночной экономики зависит от устойчивости социально-экономического положения библиотек и определяется полнотой,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ